# Юбілей — на ўвесь год

**Юбілей Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі мае сусветнае значэнне і ўнесены ў каляндар памятных дат UNESCO. І нездарма: разнастайныя мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю НББ, праходзяць на працягу ўсяго 2022 года.**

Гэта і навуковыя канферэнцыі, і выставачныя праекты і сацыякультурныя мерапрыемствы, і навукова-даследчыя работы, і выдавецкія праекты. У прыватнасці, да XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў быў выдадзены альбом "100 рарытэтаў: да юбілею Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі", у якім прадстаўлены выявы рукапісаў і старадрукаваных выданняў з фонду НББ. Асобнікі альбома прызначаны для ўстаноў культуры.

Сярод знакавых мерапрыемстваў, якія ладзяцца з нагоды юбілею Нацыянальнай бібліятэкі, таксама ўрачыстае гашэнне паштовага блока, прэзентацыя аднаўленага вучэбнага дапаможніка "Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку". На 15—16 верасня запланаваны IX Міжнародны кангрэс "Бібліятэка як феномен культуры", які будзе прысвечаны тэме "Лічбавая трансфармацыя бібліятэк: пераемнасць і вектар развіцця". На яго палях пройдзе XXVI Агульны сход членаў некамерцыйнага партнёрства "Бібліятэчная Асамблея Еўразіі".

Падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Добрушы Нацыянальная бібліятэка Беларусі да свайго 100-годдзя прадставіла выставу "Кніжны век", якая, як своеасаблівы акумулятар і транслятар вопыту, назапашанага продкамі, захоўвае памяць пакаленняў і духоўную спадчыну краіны, свету, адкрывае доступ да гэтых скарбаў. Дапоўніла выставу экспазіцыя рэдкіх і каштоўных матэрыялаў, прысвечаных гісторыі і дзеячам Гомельшчыны. Гэтая частка экспазіцыі прымеркавана да 880-годдзя з часу першай згадкі Гомеля. Таксама госці свята здолелі пазнаёміцца з прэзентацыямі інфармацыйных рэсурсаў "Бібліятэчная справа Беларусі ў асобах"," Бібліятэчная справа Беларусі ў дакументах і матэрыялах", прысвечаных 100-годдзю НББ.

Падрыхтавана перасоўная фотавыстава "Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра". Яе экспанаванне плануецца ў краінах СНД, таксама ўключана ў план выкарыстання маёмасці дзелавога і культурнага комплексу пасольства Беларусі ў Расіі на лістапад 2022 года. Прэзентацыя выставы запланавана таксама ў рэгіёнах Беларусі і Расіі.

Стагоддзю прысвечана і даследчая работа "Беларуская бібліяграфія ў асобах". Яе мэта — абагульненне ведаў аб персанальным складзе беларускай бібліяграфіі на працягу ўсёй гісторыі яе развіцця (прыкладна з XVI стагоддзя да нашых дзён). Вывучана дзейнасць людзей, якія садзейнічалі складанню бібліяграфічнай прадукцыі, распрацоўцы арганізацыйных, тэарэтычных, метадалагічных пытанняў бібліяграфіі, навучальнага працэсу. Вынікам працы стала аднайменнае даведачнае выданне, прэзентацыя якога прымеркавана да юбілею НББ.

Сумесна з выдавецтвам "Беларусь" падрыхтаваны альбом "Нацыянальная бібліятэка Беларусі" (аўтарскі калектыў бібліятэкі) на беларускай, рускай і англійскай мовах. Выданне прадставяць гасцям і ўдзельнікам юбілейных мерапрыемстваў, перададуць партнёрам НББ, таксама яно паступіць у кнігагандлёвую сетку.

Адбудзецца ўрачыстая цырымонія віншавання і ўзнагароджання работнікаў бібліятэкі, ушанаванне ветэранаў.